304-1
2083

ISSN 1818-4278

# Бібліятэка прапануе

№7/2018 • ліпень



# V Форум бібліятэкараў Беларусі

**30 мая — 1 чэрвеня**
**2018 года**
**Мінск — Жодзіна**

**Беларуская бібліятэчная асацыяцыя**

www.bla.by




18+

# Юбілейны V Форум бібліятэкараў Беларусі

















**Гэта падзея адбылася 30 мая – 1 чэрвеня бягучага года. Арганізатары, як заўсёды, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, Нацыянальная бібліятэка Беларусі.**

На V Форум зарэгістравалася 379 чалавек, гэта болей, чым на мінулыя. Адкрыццё і першы дзень работы Форума прайшлі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Усё было выдатна, але найбольшае ўражанне і гучны рэзананс атрымала рэгіянальная дыскусія "ІФЛА. Глабальнае бачанне", дзе ўдзельнікі Форума абмяркоўвалі выклікі і магчымасці, з якімі сутыкнулася бібліятэчная супольнасць сёння. Гэта цікавая форма работы, і яна захапіла ўсіх удзельнікаў дыскусіі.

Другі дзень Форума быў пабудаваны нетрадыцыйна: адбылося выязное паседжанне на базе Цэнтральнай гарадской бібліятэкі Жодзіна "Інавацыйныя формы работы публічнай бібліятэкі", потым экскурсія на БелАЗ.

А ў Мінску ў гэты дзень прайшло шэсць майстар-класаў: "Арганізацыя выставачнай дзейнасці ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі"; "Бібліятэчны каворкінг: ад ідэі да працы над памылкамі" – вопыт Навуковай бібліятэкі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта; "Валанцёры і бібліятэка: вопыт арганізацыі курсаў вывучэння замежных моў (на бясплатнай аснове) у Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна"; "Арганізацыя аматарскіх аб'яднанняў пры публічнай бібліятэцы №7 г. Мінска"; "Арганізацыя работы з дзецьмі ў Цэнтралізаванай сістэме дзіцячых бібліятэк г. Мінска" і "Арганізацыя прасторы бібліятэкі, аўтаматызацыя бібліятэчных працэсаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце".

Трэці дзень – падвядзенне вынікаў, аналіз праведзенай работы, прапановы ў выніковы дакумент.

Агульная думка ўдзельнікаў – V Форум бібліятэкараў Беларусі стаў адметнай падзеяй у іх прафесійным жыцці! І гэта ўжо старонка гісторыі бібліятэчнай справы Беларусі.

Наступны Форум у 2021 годзе.




